маім, мудрым і працавітым землякам – з нізкім паклонам і сыноўскай удзячнасцю».

---

1. *Кулагін, А. М.* Каталіцкія храмы Беларусі / А. М. Кулагін. – Мінск : БелЭн, 2008. – С. 181.

# ДАСЛЕДАВАННЕ І ЗБІРАННЕ РЭЛІГІЙНАГА ФАЛЬКЛОРУ НА ВІЦЕБШЧЫНЕ

***В. І. Раманенкава,***
*кандыдат мастацтвазнаўства, старшы выкладчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Сучасны стан рэлігійнага фальклору займае асаблівае месца ў антрапалагічных даследаваннях культуры хрысціянскіх канфесій усяго свету. Рэлігійны фальклор з'яўляецца сутворцам сучаснай сакральнай культуры. Гэта своеасаблівы светапогляд, які сфарміраваны вакол дактрынальнай рэлігійнасці, у выніку чаго паўстае ўнікальная рэальнасць.

Фальклор складаецца як мінімум з двух класаў з'яў: першы клас – звычаі, рытуалы, вераванні, часам дахрысціянскія або «ахрысціянізаваныя» (якім нададзены хрысціянскі сэнс і значэнне). Гэта група разнастайных звычаяў і абрадаў рэлігійнага або свецкага характару з агульнымі перакананнямі і ўяўленнямі, як правіла, магічнымі. Другі клас з'яў – гэта праяўленне мастацкай культуры, якая з'яўляецца складовай часткай звычаяў і абрадаў, такіх як песні, часта ў спалучэнні з танцамі, прамовы, апавяданні, бывальшчыны. Увесь матэрыял, які называюць фальклорам, уключае ў сябе з'явы ў галіне ўстаноўленых звычаяў агульнага, паўсюднага, універсальнага характару, а не асобных частак рытуалу. Такім бачыць фальклор польскі культуролаг Ю. Кжыжаноўскі [4, с. 218]. Аўтар азначэння звяртае ўвагу на тое, што фальклор – гэта з'ява, якая набыла пэўныя рысы хрысціянства або ўвогуле сфарміравалася пад яго уздзеяннем (позні фальклор). Некаторыя даследчыкі (П. Броўн [2, с. 27–89 ], Д. Ёдэр [8, 1–15], Л. Прыміана [6, с. 37–56] і інш.) вылучаюць асобную самастойную галіну фальклору – рэлігійны фальклор.

У музыкалогіі існуць два асноўныя падыходы вывучэння фальклору: паводле аднаго ён расцэньваецца як нейкая статычная форма, якая ўсё больш і больш знікае з цягам гістарычнага

часу, паводле другога фальклор гэта з’ява, якая валодае «самарухам» (працэсам пастаяннага развіцця). Некаторыя даследчыкі (Т. Гузянкова, Г. Науман) гэты рух самаразвіцця лічаць праявай «шматмоўнай», якая накіравана ў бок разбурэння мастацкіх каштоўнасцей [5, с. 56], з другога боку самаразвіццё фальклору разглядаецца як з’ява пазітыўная і не толькі як факт развіцця пласта культуры, але і як фактар народнай творчасці. Таму сучасная фальклорна-культурная сітуацыя з’яўляецца сталай часткай развіцця агульнамастацкай спадчыны краіны і выступае як самастойна прагрэсіруючы працэс фармавання народнай культуры праз рэлігійныя традыцыі.

Даследаваннямі ў галіне царкоўнай і бытавой музыкі займаецца вялікая колькасць замежных і айчынных навукоўцаў, але спецыяльных даследчых прац, якія асвятлялі б праблемы гісторыі, тэорыі і метадаў збору рэлігійнага фальклору ў Беларусі, практычна не існуе ні ў беларускім, ні ў замежным мастацтвазнаўстве.

Традыцыі беларускай народнай музычнай культуры, у склад якой уваходзіць бытавая рэлігійная музыка, былі ў цэнтры ўвагі прызнаных карыфеяў этнамузыкалогіі і фалькларыстыкі П. Бяссонава, Т. Варфаламеевай, Я. Гіпіус, І. Казаковай, М. Ларчанкі, А. Ліса, З. Мажэйка, М. Равенскага, П. Шпілеўскага, П. Шэйна, В. Ялатава. Немалую ўвагу надавалі беларускаму рэлігійнаму музычнаму фальклору польскі і чэшскі даследчыкі Л. Куба, О. Кольберг.

Заходнееўрапейскія музыказнаўцы і фалькларысты пачалі звяртаць увагу на традыцыйную бытавую спеўную рэлігійную спадчыну ў XIX ст. Польскі даследчык-фалькларыст О. Кольберг, святар і музыказнаўца Я. Седлецкі вылучалі песні з рэлігійным зместам, не прызначаныя для выканання на літургіі, і акрэслівалі іх як самастойны музычны жанр – «рэлігійныя песні» [3; 7]. О. Кольберг выдае саракатомную працу «Народ. Яго звычаі, спосаб жыцця, мова, паданні, абрады, песні…», два тамы з якіх прысвечаны беларускаму фальклору «Беларусь – Палессе» і «Літва» [3].

Рускі этнамузыколаг беларускага паходжання Г. Таўлай піша пра тое, што чэшскі фалькларыст Л. Куба ў 1887 г. у Празе апублікаваў навуковае даследаванне аб беларускім фальклоры «Беларускія народныя песні». Гэта першае даследаванне музычнай мовы беларускай народнай песні, у змест якога былі ўключаны рэлігійныя бытавыя песні [1].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На тэрыторыі Беларусі збіраннем фальклору, у лік якога ўваходзілі бытавыя песні з рэлігійным зместам, займаліся М. Равенскі, Я. Чачот, П. Шэйн, М. Янчук і інш. Але ні адзін з аўтараў не засяродзіў сваёй увагі выключна на рэлігійных песнях, таму што на пачатковай стадыі збірання фальклору гэты жанр трактавалі як адзін з фрагментаў агульнапрынятай рэлігійнай культуры або як элемент каляндарна-абрадавага фальклору.

Больш дэтальнае тэарэтыка-аналітычнае вывучэнне рэлігійных песень распачалі ў 1970 г. навукоўцы Інстытута музыкалогіі Каталіцкага ўніверсітэта ў Любліне (Польшча). Па ініцыятыве ксяндза К. Мруўца ў супрацоўніцтве з Я. Стэшэўскім, які падрыхтаваў для працы групу студэнтаў, пачалі праводзіць першыя экспедыцыі па зборы непасрэдна рэлігійнага фальклору. У 1971 г. да гэтай групы далучыліся Б. Барткоўскі, В. Даніелевіч і А. Зола, якія сталі галоўнымі тэарэтыкамі ў даследаванні структуры жанраў, рытму, меладыі, ладоў і інш. музычна-тэарэтычных элементаў рэлігійных песень. У Беларусі пакуль што падобнага інстытута не створана, але некаторыя творы польскага рэлігійнага фальклору прадстаўлены ў беларускай культуры Віцебшчыны.

У XX ст. узрастае зацікаўленасць беларускім рэлігійным фальклорам у айчынных даследчыкаў, але напачатку рэлігійная бытавая музыка разглядалася ў непарыўнай сувязі з агульнафальклорнай музыкай. Сучаснымі тэарэтычна-гістарычнымі аспектамі даследавання беларускіх рэлігійных песень займаюцца Л. Баранкевіч, Л. Густова, Л. Касцюкавец, Т. Ліхач, У. Неўдах. Грунтоўная праца ў галіне беларускага фальклору прадстаўлена ў шасцітомніку «Традыцыйная мастацкая культура Беларусі» калектыву аўтараў (В. Басько, Т. Валодзіна, М. Козенка, Т. Кухаронак, І. Смірнова, В. Цітоў) пад агульнай рэдакцыяй беларускага фальклырыста Т. Варфаламеевай. Кнігі прэзентуюць значную часту рэлігійнага фальклору (пасхальнага, поставага і інш.).

Гісторыя і культура Беларусі насычана вялікай колькасцю падзей, якія такім ці іншым чынам уздзейнічаюць на фарміраванне і бытаванне фальклору і свядомасці чалавека. Рэлігійны фальклор з'яўляецца непасрэдным транслятарам тых асаблівасцей, якімі насычае нас гісторыя. Падчас экспедыцый па парафіях Беларусі з мэтай збірання рэлігійнага фальклору найбольш шырока быў даследаваны Віцебскі рэгіён таму, што на Віцебшчыне найбольш яскрава прадстаўлена беларуская



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэлігійная традыцыя ў адрозненне, напрыклад, ад Гродзеншчыны. Рэлігійны фальклор у Гродзенскім рэгіёне праяўляецца ў рамках польскай рэлігійнай традыцыі, што ў большай ступені абумоўлена геаграфічным становішчам. Уздзеянне польскай рэлігійнай традыцыі выяўляецца як у дачыненні мовы, так і ў дачыненні мастацтва.

Рэлігійны фальклор Віцебшчыны ў значнай ступені прэзентуе песні на Божае Нараджэнне («А ўчора з вячора», «Нова радасць стала», «Хто да ясляў Бэтлеемскіх» і інш.), песні перыяду Вялікага посту («А жылі-былі няверныя людзі», «Яшчэ сонца не заходзіць» і інш.) і пасхальныя песнапенні («А на моры гібка кладка», «Аллелюя! Бог ускрос», «Вялік святой» і інш.).

Сучасны рэлігійны фальклор Віцебшчыны выразна падкрэслівае традыцыйны народна-фальклорны падыход да спеваў і валодае наступнымі характарыстыкамі:

– тэмбравая афарбоўка голасу («глыбокія» грудныя спевы);

– насычанасць гучання (моцны галосны гукапасыл);

– дыяпазон (спеўны дыяпазон твораў гнуткі і яго рэгулююць самі выканаўцы: у выпадку, калі з’яўляюцца празмерна высокія або нізкія ноты, спевакі свабодна замяняюць іх на «падыходзячыя» зручныя гукі);

– дыханне (зручная для выканаўцы сістэма спеўнага дыхання, не падпарадкаваная агульнапрынятым спеўным нормам);

– паўзы (выкарыстоўваецца свабоднае паўзіраванне ў любым месцы твора);

– арнаментыка (спевы аздабляюцца фаршлагамі, спадамі, падгучваннямі і інш.);

– зменлівасць тэксту (некаторыя літары або словы паэтычных тэкстаў песен могуць замяняцца – агаласоўваюцца зычныя, рэдуцыруюцца галосныя);

– варыяцыйнасць тэкставая і меладычная і інш.

Акрамя абазначаных характарыстык спеўнай манеры, у рэлігійнай фальклорнай музыцы трэба адзначыць яшчэ такую рысу, як мяккасць гучання. Беларускі песенны фальклор па сваёй прыродзе мае гучны, загукальны характар выканання, але ў творах рэлігійнага фальклору гучанне набывае асабліваю мяккасць, прыцішанасць, нагадваючы тым самым харальныя спевы (царкоўныя песнапенні, грыгарыянскі харал).

Такім чынам, рэлігійны фальклор Віцебшчыны мае вялікі патэнцыял для яго збірання і даследавання. Класіфікацыя, жанравасць, функцыянальнасць, бытаванне, сюжэтнасць і музыч-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

на-тэарэтычны аспекты рэлігійнага фальклору маюць патрэбу ў вывучэнні і канкрэтызацыі.

Рэлігійная спадчына, культура, грамадства непарыўна суіснуюць і ствараюць агульную выхаваўча-пазнавальную структуру развіцця чалавека. Рэлігійны фальклор з'яўляецца яскравым элементам і функцыянальным звяном гэтай складанай структуры.

1. *Тавлай, Г.* Музыкальные фольклорные собрания О. Кольберга, Л. Кубы / Г. Тавлай // Белорусская этномузыкология: очерки истории (XIX–XX вв.) / З. Можейко [и др.]. – Минск, 1997. – С. 63–66.

2. *Brown, P.* The Cult of the Saints: Its Rise and Function in Latin Christianity / P. Brown. – Chicago : The University of Chicago Press, 1981. – 187 p.

3. *Kolberg, O.* Dzieła wszystkie. Białoruś – Polesie / O. Kolberg ; z rękopisów oprac. Stanisław Kasperczak, Aleksander Pawlak ; red. Agata Skrukwa. – Kraków : Polskie Wydawnictwo Muzyczne, 1968. – XLIII, 571 s.

4. *Krzyżanowski, J.* Słownik folkloru polskiego / J. Krzyżanowski. – Warszawa : Wiedza Powszechna, 1965. – 487 s.

5. *Naumann, H.* Primitive Gemeinschaftskultur / H. Naumann. – Jana : University of Michigan Library, 1921. – 212 p.

6. *Primiano, L. N.* Vernacular Religion and the Search for Method in Religious Folklife / L. N. Primiano // Western Folklore «Reflexivity and the Study of Belief», 1995. – Vol. 54, № 1. – P. 37–56.

7. *Siedlecki, J.* Śpiewnik kościelny / J. Siedlecki. – Kraków : Instytut Teologiczny Księży Misjonarzy, 1994. – 894 s.

8. *Yoder, D.* Toward a Definition of Folk Religion / D. Yoder // Western Folklore. – Special issue «Symposium on Folk Religion». – 1974. – 33 (1). – P. 1–15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РОЛЬ МИНИАТЮРНОЙ КНИГИ В РАЗВИТИИ ИНТЕРЕСА СТУДЕНЧЕСКОЙ МОЛОДЕЖИ К НАЦИОНАЛЬНОЙ ЛИТЕРАТУРЕ И КУЛЬТУРЕ

***Т. В. Ротько,***

*кандидат искусствоведения, заместитель начальника научно-исследовательского отдела Белорусского государственного университета культуры и искусств*

Книга по праву принадлежит к величайшим достижениям человечества. Ее роль в духовно-нравственном воспитании и интеллектуальном формировании личности, в аккумулирова-